Жр 3248
07
238

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ—ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# Ленінскі шлях

Орган Буда-Кашалёўскага РК КП(б)Б

№ 5 18 ВЕРАСНЯ 1943 года

„Усе зладзействы мы заносім у суровы рахунак, які прад'явім Гітлеру і яго кліке ў дзень вазмездзія. Але не будзе літасці і тым, хто заадно з фашыстамі заносіў сваю гнусную лапу над галовамі совецкіх людзей".

Бібліятэка АН БССР

## ЗАГАД ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА

### ГЕНЕРАЛУ АРМІІ ПАПОВУ

Войскі Бранскага фронта, прадаўжаючы развіваць наступленне паспяхова фарсіравалі раку Дзясна і аднačасовым ударам з поўначы і ўсхода, сёння, 17 верасня, зламаўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі важнейшым апорным пунктам абароны немцаў на рубяжы гэтай ракі, буйным прамысловым цэнтрам—горадам БРАНСК і г. БЕЖЫЦА. У баях за гарады Бранск і Бежыца разгромлены 339, 110, 707, 95, 299, 134 пяхотныя дывізіі немцаў.

Такім чынам, у рэзультаце ўмела праведзенага абходнага манеўра па цяжка даступнай лясіста-балотнай мясцовасці, войскі Бранскага фронта прабілі другую брэш у абароне немцаў па рацэ Дзясна.

У баях пры фарсіраванні ракі Дзясна і за авалодание г.г. Бранск і Бежыца вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта Федзюнінскага і лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Науменка. Асабліва вызначыліся: 197 стралковая дывізія падпалкоўніка Абашэва, 323 стралковая дывізія палкоўніка Украінец, 4 стралковая дывізія палкоўніка Вараб'ёва, 273 стралковая дывізія палкоўніка Валодзіна, 3 гвардэйская знішчальная авіяцыйная дывізія палкоўніка Ухава, 313 начная бліжне-бамбардыровачная авіяцыйная дывізія палкоўніка Воеводзіна, 277 інжынерны батальён палкоўніка Мамонава, 140 інжынерна-сапёрны батальён маёра Лісіна, 310 гвардэйскі мінамётны полк падпалкоўніка Коўчур, 74 гвардэйскі мінамётны полк маёра Джарыдзэ.

У азнаменаванне атрыманай перамогі, вызначыўшымся ў баях пры фарсіраванні ракі Дзясна і за вызваленне гарадоў Бранск і Бежыца злучэнням і часцям прысвоіць найменаванне „БРАНСКІХ": 197 стралковай дывізіі, 323 стралковай дывізіі, 3 гвардэйскай знішчальнай авіяцыйнай дывізіі, 277 інжынернаму батальёну, 140 інжынерна-сапёрнаму батальёну; „БЕЖЫЦКІХ": 4 стралковай дывізіі, 273 стралковай дывізіі, 313 начной бліжне-бамбардыровачнай авіяцыйнай дывізіі, 310 гвардэйскаму мінамётнаму палку, 14 гвардэйскаму мінамётнаму палку. У далейшым гэтыя злучэнні і часці іменаваць: 197 Бранская стралковая дывізія, 323 Бранская стралковая дывізія, 3 Бранская гвардэйская знішчальная авіяцыйная дывізія, 277 Бранскі інжынерны батальён, 140 Бранскі інжынерна-сапёрны батальён, 4 Бежыцкая стралковая дывізія, 273 Бежыцкая стралковая дывізія, 313 Бежыцкая начная бліжне-бамбардыровачная авіяцыйная дывізія, 310 Бежыцкі гвардэйскі мінамётны полк, 74 Бежыцкі гвардэйскі мінамётны полк.

За паспяховае фарсіраванне ракі Дзясна камандарма, а таксама камандзіраў вызначыўшыхся злучэнняў і часцей прадставіць да ўзнагароды ордэнам СУВОРАВА.

Сёння 17 верасня ў 21 гадзіну 30 хвілін сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе нашым доблесным войскам, паспяхова фарсіраваўшым раку Дзясна і вызваліўшым гарады Бранск і Бежыца,—12-цю артылерыйскімі залпамі з 124 гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях і фарсіраванні ракі Дзясна і вызваленні гарадоў Бранск і Бежыца.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Смерць нямецкім захопнікам.

ВЯРХОЎНЫ ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ
МАРШАЛ СОВЕЦКАГА САЮЗА
І. СТАЛІН.

17 верасня 1943 г. Масква, Крэмль.

## З аперзводак Совінформбюро

16 верасня войскі Паўночна-Каўказскага фронта занялі горад і порт Новарасійск. На узбярэжжы Азоўскага мора заняты горад і порт Осіпенко. На Запарожскім напрамку за тыдзень з 11 па 18 верасня нашы войскі прасунуліся ад 72 да 130 клм. і занялі звыш 470 насялённых пунктаў, у тым ліку г. Гуляй-Поле.

На Кіеўскім напрамку нашы войскі прасунуліся ўперад ад 37 да 62 клм. Занята звыш 320 насялённых пунктаў, у тым ліку горад і чыгуначны вузел Нежын, г. Ромны і рад райцэнтраў. Войскі Бранскага фронта занялі г. г. Ноўгарад-Северскі, Дзяцькова.

Нашы войскі паспяхова развівалі наступленне на Палтаўскім, Краснаградскім, Паўлаградскім, Прылукскім, Рослаўльскім напрамках.

Эср 3248



## КОМСАМОЛЬЦЫ— ПЕРАДАВЫ АТРАД

Комсамольская арганізацыя нашага атрада яшчэ маладая. За кароткі час свайго існавання яна вырасла ў некалькі разоў. Разам з ёю раслі і комсамольцы. Радавыя байцы Іван П., Аляксандр Б. і Сяргей С. вырасалі да камандзіраў аддзяленняў.

Комсамольцы аказалі атраду вялікую дапамогу ў набыцці зброі і боепрыпасаў. Сяргей С. наладзіў супроцьтанкавую гармату. З яе ўжо знішчан не адзін дзесятак фашыстаў. Георгій С. дастаў ручны кулямёт, 12 вінтовак, Грыгорый Л.—станкавы кулямёт, Аляксандр Б.—5 вінтовак, Іван Е.—5 вінтовак, Уладзімір Б.—11 вінтовак і пісталет.

Нашы комсамольцы праводзяць таксама і агітацыйна-масавую работу. Добра спраўляюцца з гэтай работай агітатары Пётр К. і Іван П. Зразумела расказваюць яны насельніцтву аб перамогах Чырвонай Арміі, чытаюць газеты. Кожны дзень яны нясуць у масы бальшэвіцкую праўду.

Узятыя на сябе абавязацельствы па дастойную сустрэчу 25-годдзя Ленінска-Сталінскага комсамола комсамольцы і несаюзная моладзь з чэсцю выканаюць. У свае баявыя рахункі мы ўпішам не адзін дзесятак пушчаных пад адкос варожых эшалонаў і знішчаных чужынцаў.

ВАСІЛЬ П.
Пом. камісара па комсамолу атрада імені Фурманава.

## Заданне перавыканалі

Восенню 1942 года ідучы ў глыбокі тыл ворага мы натрапілі на склад патронаў. Прыкапаць іх—рашылі мы.

Прайшло ўсяго некалькі месяцаў і наша маленькая дыверсійная група разраслася ў вялікі атрад. Вось тут і спатрэбіліся нам патроны.

Камандванне атрада напраўляе роту з заданнем—забраць захаваныя патроны. Я, Вера С., Эдуард В. павінны ісці разам з ротаю і паказаць месца захавання патронаў. Гэта заданне была выканана.

З цяжкім грузам на адваротным шляху мы пераходзім аснаўную перашкоду—чыгунку.

Аляксандр Д., Грыгорый С., Эдуард В. і я тут-жа яе замініравалі.

Адыйшоўшы крокаў 500 мы яўственна разлічылі аддаленнае пыхценне паравоза. Вось яно бліжэй і бліжэй. І раптам блеск, грохат, скрэжат метала, шыпенне пара—усё гэта злілося ў адзін гул. Эшалон зляцеў у адкос.

У рапарце камандзіру мы з гонарам напісалі—заданне перавыканана.

АЛЯКСАНДР Ч.

## Наш удар па ворагу

Луна павольна плыла па небасклону. Навокал ціха. Прыслухоўваючыся да шораха, трэска сухога галля, шалеста лісця, асцярожна прабіралася да чыгункі дыверсійная група пад камандваннем Аляксея Д. Луна захавалася за хмару. Пільным позіркам і чуткім слухам устанавілі, што ахраннікаў паблізу няма. Я, камандзір групы і Пётр Р. узбягаем на насып. З маланкавай хуткасцю паставілі міну.

Раніцай мы пачулі грохат прыбліжаўшагася поезда. Ад нашай міны ён паляцеў у адкос. У выніку крушэння знішчана 90 жандармаў і здраднікаў.

На рахунку кожнага дыверсанта нашай групы налічваецца па некалькі падарваных эшалонаў. Камандзір дыверсійнай групы Аляксей Д. пусціў пад адкос 11 эшалонаў, падарваў 2 масты і 12 рэек. На рахунку Пятра Р. і Сяргея Х. па 2 эшалоны.

На гэтых дасягненнях мы не застановімся. Будзем усё больш павялічваць свой баявы рахунак.

СЯРГЕЙ Х. і МІХАІЛ Ф.
атрад імені Чапаева.

## Зверства фашыстаў

Раніца 11 верасня была ціхая, як і ў папярэднія дні. Насельніцтва вёскі Г. было занята працай. Раптам на вёску наляцеў фашысцкі сцервятнік і пачаў кідаць бомбы. Хутка вёска запылала пажарам. Нягоднік кружыўся над вёскай і страчыў з кулямётаў. Ён не даваў людзям выратоўваць маёмасць.

За свае паражэнні на фронце фашысты зганяюць злобу у здзеках над мірнымі людзьмі. Але недалёк час калі мы прыпомнім фашысцкім крывапіўцам усе іх зверствы.

МІХАІЛ Д.

## КАПІТУЛЯЦЫЯ ІТАЛІІ

Лондан, 8 верасня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што штаб саюзных войск ў Паўночнай Афрыцы паведаміў аб капітуляцыі Італіі.

Агенцтва Рэйтэр у радыёграмах з Нью-Йорка паведамляе, што саюзнікі прадставілі Італіі перамір'е. У тэксце заявы, апублікаванай галоўнакамандуючым узброенымі сіламі саюзнікаў генералам Эйзенхаўэрам, гаворыцца:

,,Італьянскі ўрад безагаворачна капітуліраваў з сваімі узброенымі сіламі. Як галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі саюзнікаў, я прадставіў перамір'е на ўмовах прадстаўленых Саюзным Каралеўствам, Злучанымі Штатамі і Саюзам Сацыялістычных Рэспублік. Такім чынам, я дзейнічаю ў інтарэсах Аб'яднаных нацый. Італьянскі урад абавязаўся павінавацца безагаворачна гэтым умовам. Перамір'е падпісана маім прадстаўнікам і прадстаўніком маршала Бадольо і яно ўваходзіць у сілу з гэтага моманта. Ваенныя дзеянні паміж узброенымі сіламі Аб'яднаных нацый і Італіяй спынены. Неадкладна ўсе італьянцы павінны поўнасцю выгнаць германскага агрэсара з італьянскай тэрыторыі і атрымаць дапамогу і падтрымку Аб'яднаных нацый"

РЭДКАЛЕГІЯ